■ ПАРЛАМЕНЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

# У фармаце сустрэч

**Работа ў акрузе дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Валянціны Вітальеўны Ражанец пачалася 19 сакавіка з прыёму грамадзян і правядзення 20 сакавіка «прамой тэлефоннай лініі» сумесна з галоўным урачом Слуцкага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Паўлам Валер’евічам Кучко.**



Хвалявалі случчан пытанні добраўпарадкавання дваровых тэрыторый, рэгістрацыі гаражоў у спажывецкім кааператыве, праблемы асабістага характару, не страчвае актуальнасць стан вуліц і дарог. Пасля ліквідацыі наступстваў падтаплення грунтовымі водамі на вуліцы Чыгуначнай у Слуцку не ўсе работы завяршылі службы жыллёва-камунальнай гаспадаркі, пра што паведаміла Ларыса Аляксандраўна Разумец. Сігнал пацвердзіўся: пасля выезду на месца галоўны ўрач ЦГіЭ даручыў прыняць адпаведныя меры. Разам з намеснікам старшыні райвыканкама па жыллёва-камунальнай гаспадарцы Дзмітрыем Віктаравічам Бандарэвічам, намеснікам начальніка вытворча-тэхнічнага аддзела Слуцкай ЖКГ Кацярынай Іванаўнай Волчак дэпутат сустрэлася з жыхарамі дома на вуліцы Ленінскай, якія скардзіліся на рэгулярныя падтапленні падвала. Як справіцца з сітуацыяй, будзе вызначана пасля абследавання жыллёвага фонду спецыялістамі ЖЭУ-1. Яшчэ па адным адрасе выязджалі, каб праверыць выкананне патрабаванняў заканадаўства пры правядзенні будаўнічых работ у жылым доме.

Прыемна, што случчане звяртаюцца не толькі з праблемнымі пытаннямі, але і з прапановамі па іх вырашэнні. Так, падчас прыёму жыхар горада Георгій Фёдаравіч падзяліўся сваім бачаннем парадку аплаты дзяржаўнай пошліны за допуск транспартных сродкаў да ўдзелу ў дарожным руху.

Сустрэчы са случчанамі прадоўжыліся падчас рэспубліканскай акцыі прафсаюза работнікаў аграпрамысловага комплексу «Наш жывёлавод». Валянціна Вітальеўна Ражанец разам са старшынёй Слуцкай раённай арганізацыі прафсаюза работнікаў АПК Таццянай Ігараўнай Гурбо, галоўным бухгалтарам арганізацыі Святланай Алегаўнай Дубік наведалі малочнатаварныя фермы сельгасарганізацый Случчыны, павіншавалі лепшых жывёлаводаў з працоўнымі перамогамі і ўручылі ім падзячныя пісьмы, падарункі і салодкасці. Поспех калектыву залежыць ад стараннасці і прафесіяналізму кожнага працаўніка: 21 сакавіка заслужаныя заахвочванні атрымалі загадчыкі МТФ, аператары машыннага даення, даглядчыкі жывёлы ў ААТ «Ісерна». Ад прафкама сельгасарганізацыі працаўнікам таксама ўручылі каштоўныя падарункі, а хвіліны адпачынку напоўнілі канцэртнымі нумарамі загадчык Кіраўскага СДК Сяргей Мікалаевіч Міхнюк.

У адкрытым акцыянерным таварыстве «Слуцкая Ніва» 21 сакавіка прайшоў справаздачны прафсаюзны сход работнікаў гаспадаркі, быў прыняты калектыўны дагавор на чарговы перыяд. В.В. Ражанец прыняла ўдзел у сустрэчы і пазнаёміла прысутных з дзейнасцю Палаты прадстаўнікоў.

Падчас работы ў акрузе па ініцыятыве В.В. Ражанец на тэрыторыі Першамайскага сельсавета прайшла сумесная з ЦРБ акцыя «Ведай свой ціск». Акцыю супрацоўнікі медустановы праводзяць рэгулярна, але на гэты раз да традыцыйнага вымярэння артэрыяльнага ціску медыцынскія работнікі далучылі кансультацыі неўролага, вымярэнне ўзроўню цукру ў крыві і ўнутрывочнага ціску, рабілі электракардыяграмы, праводзілі вымярэнні вагі цела, росту. Арганізавана працавалі з вяскоўцамі ўрач – клінічны фармаколаг Уладзімір Паўлавіч Наўрась, урач-неўролаг неўралагічнага аддзялення ЦРБ Марыя Мікалаеўна Зяляева, медыцынская сястра афтальмалагічнага кабінета дарослай паліклінікі Людміла Аляксееўна Шпакоўская, урач агульнай практыкі (загадчык Першамайскай участковай бальніцы) Дзмітрый Сцяпанавіч Аўчарэнка, памочнік урача па амбулаторна-паліклінічнай дапамозе Сяргей Валянцінавіч Высоцкі і іншыя медыцынскія работнікі Першамайскай участковай бальніцы.

А дэпутат вяла прыём па асабістых пытаннях. Самае «балючае» – цяжкасці з водазабеспячэннем у жыхароў некалькіх вуліц, слабы напор у цэнтралізаванай сістэме: даводзіцца працяглы час чакаць, пакуль напоўніцца ёмістасць для прыгатавання ежы, а ўжо пра выкарыстанне пральных машын і гаворкі няма.

– Праблемнае пытанне, – пагадзіўся намеснік старшыні райвыканкама Д.В. Бандарэвіч, – пастараемся разабрацца, як дапамагчы.

А вось для таго, каб аднавіць заезд аўталаўкі ў вёску Гольчычы, перашкод няма, адзначыў дырэктар базы аблспажыўсаюза Віктар Іванавіч Гурыновіч, а яшчэ паабяцаў пракантраляваць асартымент тавараў у магазінах, бо некаторыя жанчыны наракалі на адсутнасць швейных нітак.

Дыялог атрымаўся плённы, некаторыя пытанні адпаведныя службы і арганізацыі ўзялі на кантроль.

– Вялікі дзякуй усім, хто да нас прыехаў, – гаварылі вяскоўцы. – Нам вельмі зручна атрымаць кансультацыі прафесіяналаў па месцы жыхарства.

Падчас прыёму грамадзян Галіна Адамаўна Ермакова, Ніна Уладзіміраўна Гаўрыловіч і іншыя жыхары Першамайскага сельсавета выказалі ўдзячнасць за такі фармат сустрэч.

**Вера БАГДАНОВІЧ,**
**памочнік дэпутата.**

■ У РАЙВЫКАНКАМЕ

# Аб надзённых задачах

**Аб гатоўнасці сельскагаспадарчых арганізацый раёна да правядзення сёлетняй веснавой пасяўной кампаніі і рэалізацыі патрабаванняў Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №18 «Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай абароне дзяцей у няўдачных сем’ях» у Слуцкім раёне ў 2017 годзе ішла размова на чарговым пасяджэнні раённага выканаўчага камітэта на мінулым тыдні.**

У ім прынялі ўдзел дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Валянціна Вітальеўна Ражанец, намеснік міністра юстыцыі Беларусі Ігар Геранінавіч Тушынскі, першы намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Валянцін Баласлававіч Татарыцкі, члены выканкама, начальнікі ўпраўленняў і аддзелаў райвыканкама, дырэктары некаторых прадпрыемстваў і арганізацый Случчыны.

## Палявыя работы

Першы намеснік старшыні райвыканкама, начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Дзмітрый Сяргеевіч Каралёў праінфармаваў удзельнікаў пасяджэння, што сёлета яравую сяўбу плануецца правесці на плошчы 45 532, у тым ліку яравыя збожжавыя і зернебабовыя культуры з кукурузай на збожжа зоймуць 17 620 га (з іх зернебабовыя культуры 1 617 га), цукровыя буракі – 5 742 га, лён-даўгунец – 2 435 га, бульба – 450 га, агародніна – 25 га, кукуруза на сілас – 13 560 га, аднагадовыя травы – 5 700 га.

Мінеральных угнаенняў пад яравую сяўбу з улікам падкормак азімых культур, шматгадовых траў і лугавых угоддзяў неабходна 26,9 тысячы тон дзеючага рэчыва. Па стане на 21 сакавіка назапашана 42% да неабходнага. Пры заданні 1 100 тысяч тон на палеткі вывезена 950 тысяч тон арганічных угнаенняў, або 86%.

Сельгасарганізацыі раёна поўнасцю забяспечаны насеннем збожжавых і зернебабовых культур (148,7% да неабходнага), бульбы, шматгадовых траў.

На 44% забяспечаны сельскагаспадарчыя арганізацыі пратручвальнікамі. Працягваецца назапашванне сродкаў аховы раслін.

Сёлета на веснавой пасяўной будзе задзейнічана 604 трактары, з якіх 97 – энерганасычаных. Плануецца, што работа энерганасычаных трактароў будзе арганізавана ў дзве змены, для гэтага на базе раённага цэнтра па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы рабочых дадаткова падрыхтавана 25 механізатараў, 18 праходзяць навучанне.

Гатоўнасць трактарнага парка ў цэлым па раёне складае 91% (спраўныя 553 трактары), гатоўнасць энерганасычаных трактароў – 97%, камбінаваных пасяўных агрэгатаў – 94%, буракавых і кукурузных сеялак – 91%, камбінаваных глебаапрацоўчых агрэгатаў – 96%.

## Дэкрэт №18

Начальнік аддзела адукацыі, спорту і турызму раённага выканаўчага камітэта Андрэй Васільевіч Нядзелька адзначыў, што рэалізацыя патрабаванняў Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №18 «Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай абароне дзяцей у няўдачных сем’ях» з’яўляецца адным з важнейшых напрамкаў дзейнасці ўсіх зацікаўленых службаў і ведамстваў.

За 2017 год у аддзел адукацыі паступіла 357 паведамленняў аб сямейным недабрабыце, знаходжанні дзяцей у сацыяльна небяспечным становішчы, 51 з іх пацвердзілася (14%). Па дадзеных паведамленнях 96 дзяцей з 51 сям’і, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, пастаўлены на ўлік. А.В. Нядзелька падкрэсліў, што суб’екты рэалізацыі Дэкрэта №18 не заўсёды своечасова выяўляюць дзяцей, якія трапілі ў сацыяльна небяспечнае становішча, і тады меры па абароне правоў і законных інтарэсаў непаўналетніх належным чынам не забяспечваюцца.

У раёне (па стане на 1 студзеня 2018 года) у сацыяльна небяспечным становішчы знаходзіліся 345 дзяцей у 177 сем’ях (у 2016 годзе – 330 з 179 сем’яў), сярод іх 42 мнагадзетныя сям’і, у якіх выхоўваюцца 143 непаўналетнія.

Установамі адукацыі і іншымі суб’ектамі прафілактыкі недастаткова ўвагі надаецца правядзенню рэабілітацыйных мерапрыемстваў з сям’ёй, пра што сведчыць павелічэнне колькасці дзяцей, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы.

Работнікамі Слуцкага райвыканкама сумесна з супрацоўнікамі аддзела ўнутраных спраў, раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях, Слуцкага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, старшынямі сельскіх выканаўчых камітэтаў і іншымі ў рамках штотыднёвых рэйдаў наведаны ўсе сем’і, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, абследаваны ўмовы жыццядзейнасці дзяцей, з бацькамі праведзены прафілактычныя гутаркі, дадзены рэкамендацыі.

Установамі адукацыі на працягу 2017 года накіравана 58 запытаў у дачыненні да 35 сем’яў у адрас прадпрыемстваў, на балансе або ва ўласнасці якіх знаходзяцца жылыя памяшканні, дзе пражываюць непаўналетнія, а жыллё мае патрэбу ў рамонце. Аказана дапамога ў рамонце жылых памяшканняў 33 сем’ям.

Асноўнай прычынай сямейнага недабрабыту па-ранейшаму з’яўляецца п’янства бацькоў і, як следства, нежаданне працаваць, сямейныя скандалы, цяжкае матэрыяльнае становішча.

Суб’ектамі прафілактыкі праводзіцца рэабілітацыйная работа з бацькамі, чые дзеці знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. Аднак не заўсёды яна мае станоўчыя вынікі. За 2017 год 23 дзіцяці адабраны ў 17 бацькоў з 11 сем’яў, рашэннем камісіі па справах непаўналетніх райвыканкама прызнаны маючымі патрэбу ў дзяржаўнай абароне. За мінулы год 6 непаўналетніх (24%) вернуты ў 3 біялагічныя сям’і. На жаль, не ўсе бацькі ствараюць належныя ўмовы, каб вярнуць дзяцей у сям’ю.

На 1.01.2018 года ў раёне выхоўваюцца 215 дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, 147 з іх выхоўваюцца ў замяшчаючых сем’ях (44 непаўналетнія – у 30 прыёмных сем’ях, 95 непаўналетніх – у 74 апякунскіх сем’ях, 8 – у дзіцячым доме сямейнага тыпу), 28 дзяцей знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні ва ўстановах адукацыі па месцы вучобы, 40 – у спецыялізаваным доме дзіцяці. Таксама 56 непаўналетніх выхоўваюцца ў 44 сем’ях усынавіцеляў.

Не менш важная задача, пастаўленая Дэкрэтам №18, – пакрыццё расходаў на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, іх бацькамі.

У аддзеле прымусовага выканання Слуцкага РАУС па стане на 1 студзеня 2018 года знаходзіліся на ўліку 176 абавязаных асоб. Працэнт кампенсацыі расходаў на ўтрыманне дзяцей абавязанымі асобамі, якія пражываюць у раёне, складае 71,1. Прагулы абавязаных асоб, нежаданне працаваць, атрыманне невялікай заработнай платы (з-за нізкай прафесійнай кваліфікацыі) – асноўныя прычыны запазычанасці перад дзяржавай.

Старшыня райвыканкама Андрэй Уладзіслававіч Янчэўскі адзначыў, што неабходна прыняць адпаведныя меры па вырашэнні гэтага пытання.

Прадпрыемствы і арганізацыі раёна прадстаўляюць абавязаным асобам магчымасць адпрацаваць прагулы (звыштэрмінова, у выхадныя дні).

У абмеркаванні пытання рэалізацыі Дэкрэта №18 прынялі ўдзел начальнік аддзела аховы правапарадку і прафілактыкі Слуцкага РАУС Аляксандр Аляксандравіч Семяновіч, галоўны ўрач Слуцкай цэнтральнай раённай бальніцы Аляксандр Аляксандравіч Лінкевіч, намеснік старшыні камісіі па справах непаўналетніх Слуцкага райвыканкама Таццяна Мікалаеўна Козырава, заслуханы справаздачы суб’ектаў рэалізацыі Дэкрэта №18, прыняты адпаведныя рашэнні.

**Ірына КАВАЛЕНКА.**